— Юрий Николаевич, актер Купаловского театра Александр Подобед случайно не Ваш родственник?

— Нет. Но я видел несколько спектаклей с его участием. Кстати, у нас многие сотрудники регулярно ходят в театр, на концерты.

— Чаще всего, видимо, по долгу службы.

— Не только. Минский ОМОН давно сотрудничает с Белгосцирком, Молодежным театром эстрады, многими драматическими театрами.

— Омоновцы строем и с песней в театр ходят?

— Нет, что Вы! *(Смеется.)* Хотя над этим стоит подумать...

ПУЛЬС

Паехалі ў Ганover

Больш за 20 беларускіх прадпрыемстваў і арганізацый бяруць удзел у Гановерскім прамысловым кірмашы (ФРГ), урачыстае адкрыццё якога адбылося вечарам 6 красавіка.

Беларускія экспазіцыі на кірмашы дэманструюцца ў пяці тэматычных павільёнах. У параўнанні з мінулым годам агульная плошча гэтых экспазіцый павялічылася з 185 да 231 квадратнага метра.

У ліку экспанентаў — Беларускі металургічны завод, Мінскі падшыпнікавы завод, прадпрыемствы “Гомелькабель”, “Рэмеза” і “Сакрамент”, свабодныя эканамічныя зоны “Гомель-Ратон” і “Брэст”. Удзельнічаюць таксама вышэйшыя навучальныя ўстановы і ўстановы Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях пры Савеце міністраў Беларусі: Беларускі, Гомельскі, Гродзенскі і Полацкі дзяржаўныя універсітэты, навукова-вытворчыя аб’яднанні “ТАСПО” і “Металіт”, Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Магілёўскі і Віцебскі дзяржаўныя тэхналагічныя універсітэты, Гродзенскі інстытут сучасных ведаў, Інстытут цепла- і масаабмену і Фізіка-тэхнічны інстытут Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і некаторыя іншыя арганізацыі.

Ірына САЗАНОВІЧ.

Абледзяненне ў Брэсцкай вобласці

Мокры снег і паніжэнне тэмпературы сталі прычынай абледзянення электраправадоў, у выніку чаго 6 красавіка шэраг населеных пунктаў у трох раёнах Брэсцкай вобласці застаўся без электрычнасці.

Пацярпелі 35 вёсак у Пінскім, Іванаўскім і Камянецкім раёнах. Акрамя жылых дамоў, без электрычнасці часова засталіся 3 бальніцы, 7 дашкольных устаноў, 13 школ і 83 трансфарматарныя падстанцыі.

Пад вечар 6 красавіка падача святла аднавілася.

Ратуйма дзяцей

На працягу апошніх трох гадоў дзіцячая смяротнасць у Брэсцкай вобласці знізілася ўтрая. Разам з тым, сцвярджаюць спецыялісты Брэсцкага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, не варта цешыць сябе надзеяй.

Стан здароўя дзяцей не паляпшаецца: сёння кожнае пятае дзіця ў вобласці нараджаецца з той ці іншай паталогіяй. Больш за 38 тысяч дзяцей жывуць на забруджаных у выніку катастрофы на ЧАЭС тэрыторыях. Многія з іх, асабліва вясковыя дзеці, не маюць магчымасці збалансавана харчавацца і атрымліваць медыцынскае абслугоўванне на належным узроўні. Летась на аздараўленні знаходзіліся 23,5 тысячы юных жыхароў Брэсцкай вобласці — усяго 52 працэнты тых, хто мае патрэбу ў аздараўленні.

Асноўнымі прычынамі смяротнасці дзяцей з’яўляюцца не хваробы, а няшчасныя выпадкі, траўмы і атручванні. Гінуць дзеці пад коламі аўтамабіляў і ў агні. Так, у 2002 годзе ў выніку дарожна-транспартных здарэнняў 14 дзяцей загінулі, 112 атрымалі траўмы. За тры месяцы гэтага года двое дзяцей загінулі і 15 паранены. Летась 15 дзяцей загінулі падчас пажараў, на працягу гэтага года — ужо трое.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

«Мой родны кут»

8 красавіка ў зале Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (БДАМ) пройдзе вечар беларускай паэзіі і музыкі “Мой родны кут”.

Гэта другая праграма цыкла “Вечары беларускай культуры”, якія з’яўляюцца сумесным праектам педагагічных і студэнцкіх калектываў дзвюх ВНУ — Акадэміі музыкі і філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Мэта такіх мерапрыемстваў — збіраць разам аматараў беларускай нацыянальнай культуры.

У праграме вечара прагучыць музыка Ігара Лучанка, Юрыя Семяняткі, Ларысы Мурашка і іншых кампазітараў. Адбудзецца прэзентацыя кнігі паэта-перакладчыка Валерыя Стралко “Непагасны агонь”, у якую ўключаны пераклады на беларускую мову паэзіі Тараса Шаўчэнкі, Лесі Украінкі і Івана Франко, а на ўкраінскую мову — Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча.

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

ДИПКУРЬЕР

С любовью к Беларуси

Более 50 тонн гуманитарного груза привезет в Беларусь Миссия высших бизнес-школ Франции.

Особенность этой акции заключается в том, что французские студенты не просто собирают груз *(медикаменты, медицинское оборудование, учебники, одежду)*, ищут спонсоров и самостоятельно устраивают различные мероприятия *(музыкальные вечера, концерты, дискотеки)*, чтобы профинансировать миссию, но лично доставляют гуманитарный груз в больницы, детские дома, университеты, исследовательские институты, преодолевая значительные расстояния от Франции до страны назначения за рулем грузовиков.

Миссия высших бизнес-школ Франции — это студенческая ассоциация, основанная в 1988 году по инициативе студента Высшей национальной школы экономики и торговли города Бордо. Цель миссии — оказание материальной и моральной помощи нуждающемуся в ней населению Восточной Европы, а также установление дружественных связей между жителями страны назначения и французскими студентами.

Миссия этого года является пятнадцатой, юбилейной для студенческой ассоциации: французские студенты уже два раза приезжали в Польшу, три раза — в Румынию, шесть раз — в Украину и четыре раза — в Беларусь.

Утром 6 апреля у подножья башни Монпарнас в Париже состоялся торжественный отъезд Гуманитарной миссии высших бизнес-школ Франции. Провожал студентов в Беларусь **Люка Ферри**, министр по делам молодежи, образования и исследований Франции, под патронажем которого находится Миссия в этом году.

С 10 по 17 апреля французские студенты посетят Пинск, Могилев, Гомель, Мозырь, Бобруйск, Копаткевичи, Минск и Барановичи.

16 апреля в Доме Дружбы состоится прием, организованный Посольством Франции в Республике Беларусь, во время которого посол Франции **Стефан Шмелевский** символически вручит дар, переданный для профессора, доктора технических наук **Василия Нестеренко**. Институт радиационной безопасности “Белрад”, где работает Нестеренко, в этом году является одним из получателей гуманитарной помощи, привезенной французскими студентами.

Марина ВИШНЕВСКАЯ.

ЛЮСТЭРКА ЖЫЦЦЯ

«Сэйлы» толькі на «Белвесце»

Любы практычны чалавек, які лічыць капейчыну ў сямейным бюджэце, у тым ліку на Захадзе, апранаецца і абуваецца падчас так званых распрадаж. Яны ладзяцца, як правіла, напрыканцы сезона. У сакавіку, напрыклад, па зніжаных коштах прапануюць зімні абутак, у лістападзе — летні і восеньскі.

Логіка такіх дзеянняў простая — большасць спажыўцоў аддаюць перавагу набыццю адзення і абутку па сезоне. І таму, каб не несці дадатковых расходаў на захаванне тавара, які карыстаецца малым попытам і выходзіць з моды, прадпрымальнік “пазбаўляецца” ад яго праз гандаль па заніжаных коштах. Практыка нармальная, яе эфектыўнасць праверана часам...

Вырашыў на ўласнай скуры адчуць, як працуюць у гэтым сэнсе айчынныя гандляры. Пратупаў я пры гэтым не адзін кіламетр па мінскіх вуліцах.

У некаторых крамах гандляркі наогул не ведаюць такога слова “распрадажа”. У ЦУМе я знайшоў пару-другую зімняга абутку, але кошты на іх красаваліся звычайныя — восеньска-вясеннія. Астатні абутак, натуральна, быў выключна сезонны — туфлі, красоўкі, сандалі.

У прыватных крамах, назвы якіх рэгулярна мільгаюць у рэкламных роліках па тэлебачанні, мяне таксама чакала расчараванне. Нідзе я не знайшоў аніводнай таблічкі з надпісам “распрадажа” ці “сэйл” (ад англійскага “sale” — распрадажа. — **А.С.**) Здзівілі толькі маладыя гандляркі, якія, убачыўшы пакупніка, шпарка, як бы ў Нью-Йорку ці Лондане, кідаюцца дапамагчы выбраць добры, але вельмі дарагі абутак.



Цэны на зімні абутак, дарэчы, стартавалі ў гэтых крамах недзе ад 80 тысяч рублёў.

Стаміўшыся, я амаль згубіў надзею. Вырашыў скончыць свой бессэнсоўны шпацыр па сталіцы ў фірменнай краме вядомага беларуска-германскага прадпрыемства “Белвест”.

Эўрыка! Слова “распрадажа” ўбачыў адразу ж на вітрыне. Яно тычылася як жаночай калекцыі сезонаў 2000—2002 года, так і мужчынскіх зімовых ботаў. Знайшоў, як крычыць рэклама іншага гандляра абуткам, сабе добрую пару. З натуральнай скуры, між іншым! Яе кошт у сувязі з распрадажай знізілі з 60.000 рублёў да 46.500. Гандлярка, паважаючы мой добры настрой, яшчэ і паведаміла, што гарантыя на зімовы абутак пачынае дзейнічаць не зараз, а пасля 15 лістапада — якраз тады, калі я і збіраюся яго насіць.

Здзівіўся, палез у кішэню за грашыма. Жартуючы спытаў гандлярку: “Вы часам не сэйлзвумэн, як кажуць у Амерыцы, а я часам не ў Нью-Йорку?” “Не, усё нармалёва, — адказала яна. — Вы ў Мінску. А гэта не шоп, а наша беларуская крама”.

Так трымаць, “Белвест”!

Алесь СІЛІЧ.
Фота IREX/ProMedia.

Кто украл 3 миллиона долларов?

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Письмо это было отправлено 21 августа 2001 года. Напрасно рабочие ждали “ответа, как соловей лета”. Не дождались. И тогда за перо взялась тогдашний председатель профкома предприятия Надежда Масловская. 3 октября того же года она пишет А.Лукашенко:

“Уважаемый Александр Григорьевич!

В связи с тем, что по каким-то причинам до Вас не дошло письмо трехтысячного коллектива ОАО “Минский приборостроительный завод”, вынуждена обратиться к Вам лично как председатель профкома. Это обращение к Вам — крик души и последняя надежда на помощь и справедливость...

Трудно понять, почему миллионы долларов были перечислены в дальнее зарубежье без соответствующей проверки, почему эта валюта вернулась в Беларусь фирме-однодневке и почему только в 1999 году появилось обращение в суд нашего руководства. Наверное, для того, чтобы даже следственные органы не смогли найти концов. Так и случилось. В январе 2001 года уголовное дело было приостановлено “ввиду неустановления лица, подлежащего привлечению в качестве обвиняемого”.

Но кредит должен быть возвращен банку. В погашении долга Хозяйственный суд списывает денежные средства со счетов предприятия, наложил арест на часть производственных площадей, наметил к продаже детский оздоровительный центр “Доманово”. Посягают на заводскую поликлинику и даже на святая святых, гордость предприятия — музей 90-летней истории завода.

Просим Вашего вмешательства в решение проблемы, от которой зависит дальнейшая судьба предприятия и его трехтысячного коллектива".

Но и этот крик души остался без ответа. Правда, в конце 2001 года на предприятие поступило письмо из Следственного комитета при МВД по г.Минску, в котором говорилось: “Настоящим сообщаем, что уголовное дело №1771-700 возбуждено прокуратурой г.Минска 17.10.2000 г. по признакам ст.90 ч.4 УК РБ 1960 года в отношении представителя компании "Renacroft LTD" Ругиниса Е.Р. по факту завладения кредитными средствами АКБ “Белвнешэкономбанк” в сумме 3,5 миллиона долларов США, выделенными ПО “Белвар” для строительства завода по производству аккумуляторных батарей. 14.09.2001 г. настоящее уголовное дело через прокуратуру г.Минска направлено в прокуратуру Республики Беларусь для передачи в Литовскую Республику, гражданином которой является Ругинис Е.Р".

Так, “лицо, подлежащее привлечению в качестве обвиняемого”, все-таки установлено или не установлено?

Как же сейчас обстоят дела? На эту тему беседую с ветераном, влиятельным профсоюзным лидером предприятия Михаилом Тимошкиным и председателем Республиканского совета профсоюза радиоэлектронной промышленности Геннадием Федыничем.

— Погашение этого кредита — кабала, из которой не вылезти, — говорит Михаил Тимошкин. — Сумма долга с процентами уже перевалила 5 миллионов долларов. Пока не рассчитаемся с долгом, у нас не будет ни прибыли, ни хороших заработков. Все средства съест этот кредит.

— Не по своей вине страдает коллектив, — добавляет Геннадий Федынич. — Профсоюзная организация не может заключить с администрацией трудовой договор. Ведь вся прибыль уйдет на погашение кредита. Сейчас, в ходе переговоров по заключению договора на этот год, администрация настаивает на значительном сокращении социальных программ.

— Предпринимаем еще одну попытку донести нашу боль Александру Лукашенко, — продолжает Михаил Тимошкин. — Хотя и очень трудно это.

Из их слов узнаю, что про свою беду рабочие предприятия просили донести до руководства страны делегата профсоюзного съезда, который состоялся в прошлом году и в работе которого принимал участие Александр Григорьевич. Рабочий завода В.К.Чернухо взял с собой письмо рабочих к Лукашенко, записался в число выступающих. Но ему не дали слово, не разрешили вручить письмо главе государства, отказались даже передать его. Пришлось оставить его в секретариате съезда.

Позже поинтересовались у руководителя ФПБ Л.П.Козика судьбой письма. В ответ услышали, что он его не видел.

На днях принята еще одна, уже четвертая, попытка донести крик души заводчан до главы государства. С этой целью решили обратиться за помощью к руководителю ФПБ Л.П.Козику, который в свое время обещал разобраться и оказать содействие в решении данного вопроса. В письме ему председатель Республиканского совета профсоюза радиоэлектронной промышленности Г.Ф.Федынич, в частности, пишет:

“Ситуация на предприятии продолжает катастрофически ухудшаться. Высший Хозяйственный суд РБ принял решение об аресте значительной части имущества, принадлежащего предприятию, в пользу ОАО "Белвнешэкономбанк". В том числе объекты социального назначения — детский оздоровительный центр “Доманово”, заводская столовая. Администрация предприятия на конкурсной основе продает имущество с целью погашения кредитов, сумма которых с учетом набежавших процентов возросла до 5,1 миллиона долларов в настоящее время.

Нынешнее руководство завода в целях погашения многомиллионных кредитов (в долларовом исчислении), полученных прежним руководством и потерянных неизвестно где, всю тяжесть ситуации стремится переложить на плечи рядовых работников. Так, в прошлом году администрация в одностороннем порядке отказалась от выполнения принятых на себя обязательств по коллективному договору. В ходе переговоров по заключению нового коллективного договора на 2003 год администрация требует значительного сокращения числа ранее действовавших льгот. В их числе — отменить материальную помощь работникам к отпуску, помощь матерям-одиночкам и другие.

Информируя Вас о положении дел в ОАО “Минский приборостроительный завод”, прошу оказать содействие в получении официального ответа на обращение коллектива ОАО “Минский приборостроительный завод” к президенту Республики Беларусь Лукашенко А.Г.".

Итак, никто не хочет услышать крик заводчан. Почему? Не будет ответа на этот вопрос — не будет будущего ни у коллектива ОАО “Минский приборостроительный завод”, ни у страны в целом.

Алесь ДРАБЧУК.

Народная Воля
8 КРАСАВІКА 2003 г.

ВОЙНА В ИРАКЕ

Американские танки в центре Багдада

Войска коалиции при поддержке тяжелой бронетехники атакуют центр иракской столицы. "В данный момент мы атакуем самый центр города. То, что было на днях, — это просто наступление. Сейчас мы атакуем по-настоящему", — утверждал вчера днем майор Майкл Бирмингем из третьей пехотной дивизии. Как сообщает агентство "Ассошиэйтед Пресс", американские военные уже заняли "ключевые позиции" в иракской столице. Также возможно, что американским войскам удалось занять здание Министерства информации Ирака.

По сообщению "Рейтер", американские войска взяли под контроль один из расположенных в Багдаде президентских дворцов, и вошли во второй дворец. Над взятым президентским дворцом в Багдаде водружен флаг США.

По словам американских офицеров, сейчас наступление на Багдад идет с южного, северо-западного и юго-западного флангов. "Я надеюсь, что эта операция покажет иракскому народу, что режиму Саддама пришел конец", — заявил один из командующих наступлением полковник Дэвид Перкинс.

Информация о потерях с обеих сторон крайне скудна. Известно только о двух раненых американских военнослужащих. На мине подорвался один из танков. Руководство Пентагона заявляет, что сегодняшнее наступление американских войск в Багдаде является "демонстрацией силы".

Лидер иракской оппозиции: союзники должны остаться в Ираке на два года

Лидер иракской оппозиции Ахмад Халаби заявил журналистам, что, возможно, войскам союзников придется остаться в Ираке примерно на два года. Он заявил, что коалиционные войска должны оставаться в Ираке до тех пор, пока в стране не пройдут демократические выборы и не будет сформировано правительство.

"Я не могу точно определить временные рамки, но мы ожидаем, что новая иракская конституция будет принята в течение двух лет. И американские войска должны оставаться в стране до этого времени", — сказал Халаби.

Пауэлл отрицает, что очередными мишенями США станут Сирия и Иран

Госсекретарь США Колин Пауэлл отрицает, что после Ирака "очередными мишенями" Вашингтона станут Сирия и Иран. Как заявил глава американской дипломатии в интервью общеарабской газете "Аль-Хайят", издающейся в Лондоне, "у Соединенных Штатов нет намерений захватить эти два государства". По его утверждению, "никто в администрации США никогда не поднимал вопроса о наступлении на Иран либо Сирию".

Тем не менее госсекретарь вновь подтвердил, что указанные страны "представляют проблему из-за поддержки терроризма и разработки оружия массового уничтожения".

Ранее с опровержением готовящегося "возмездия" в отношении Сирии и Ирана выступил премьер-министр Великобритании Тони Блэр.

Наталья ГАК.
Фото Рейтер.

У СУСЕДЗЯЎ

Амерыканцы інвестуюць у польскую металургію

Амерыканскі металургічны канцэрн US Steel мае намер зрабіць апошнюю прапанову куплі акцый польскіх металургічных заводаў. Віцэ-прэзідэнт US Steel Джон Гоодзіш падкрэсліў, што яго фірма хоча забяспечыць польскай металургіі вядучыя пазіцыі ў Цэнтральнай Еўропе.

Польская металургія магла б заняць тую частку польскага рынку, патрэбы якой сёння задавальняюцца імпартнай прадукцыяй. Гоодзіш абвясціў аб распрацоўцы доўгатэрміновай праграмы развіцця, падобнай да той, якая ажыццяўляецца на купленых у 2001 годзе прадпрыемствах у Славакіі. Там у рамках 10-гадовай праграмы прадугледжаны інвестыцыі на суму 700 млн. долараў, з чаго 120 млн. будуць прызначаны на экалагічныя праекты.

Грамадскія паслугі on-line

Ужо праз тры гады палякі будуць мець магчымасць праз Інтэрнет падаць заяву на атрыманне пашпарта, пасведчання асобы ці аформіць 70 іншых спраў. Праект аб прадстаўленні грамадскіх паслуг праз Інтэрнет, які разглядаецца польскім урадам, будзе каштаваць 100 млн. еўра ў год, аднак суадносіны коштаў да эканоміі ў выніку ўкаранення праграмы акрэсліваюцца як 1:10.

У першую чаргу стануць даступнымі паслугі падатковых разлікаў, асабліва прадпрыемстваў, а таксама публічных заказаў. Укараніць сістэму плануецца на працягу трох гадоў, аднак падатковыя разлікі on-line для юрыдычных асоб стануць даступнымі ўжо пад канец бягучага года.

Палякі ў структурах Еўрапейскай камісіі

Пасля ўступлення Польшчы ў Еўрапейскі Саюз у Еўрапейскай камісіі будуць працаваць каля 2 тысяч палякаў. Камісія ўстанавіла мінімальную колькасць працоўных месц, прызначаных для прадстаўнікоў краін, якія ўступаюць 1 мая 2004 г. у ЕС. Польшча ў пачатковы перыяд атрымала прапанову на 1341 месца.

Эксперты ацэньваюць, што на працягу 10—15 гадоў прадстаўнікі новых дзяржаў — будучых членаў — будуць складаць каля 20 працэнтаў агульнай колькасці супрацоўнікаў Камісіі. Сёння там працуе 25 тысяч цывільных чыноўнікаў, сярод якіх 5 тысяч месц прызначана ў пачатковы перыяд для новых членаў.

Малыш зноў выйграў

Польскі спартсмен — лыжны скакун Адам Малыш — трэці раз запар здабыў Крыштальны шар — узнагароду асноўнай класіфікацыі Кубка Свету. Гэтым самым Адам Малыш стаў першым скакуном у гісторыі гэтай дысцыпліны, які тры сезоны запар займае першае месца ў класіфікацыі. Поспех паляка з'яўляецца асаблівым дасягненнем у спартыўнай дысцыпліне, у якой нечаканае паляпшэнне формы і яе правалы паўсюдная з'ява.

Калекцыя ўзнагарод Адама Малыша:

2001-ы — перамога на Турніры чатырох трамплінаў; залаты і сярэбраны медалі на чэмпіянаце свету ў Лахці; перамога ў асноўнай класіфікацыі Кубка Свету;

2002-ы — сярэбраны і бронзавы медалі на Алімпійскіх гульнях у Солт-Лэйк-Сіці; перамога ў асноўнай класіфікацыі Кубка Свету;

2003-ы — трэцяе месца ў Турніры чатырох трамплінаў; два залатых медалі на чэмпіянаце свету ў Прэдаццо; перамога ў асноўнай класіфікацыі Кубка Свету.

Прэс-рэліз
Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь.

Анатоль КУДРАВЕЦ

На крыжы

Яна так і называлася: "На крыжах" — тая невялікая аб'ёмам, у строга-цёмнай вокладцы кніжка Васіля Быкава, выдадзеная ў 1992 годзе. Назва наколькі лаканічная, настолькі трывожная. Як і ўсё ў яголым лёсе. Як і ўсё ў ягонай творчасці.

Гэтую назву можна было б перанесці і на ўсё яго жыццё, калі даваць назву жыццю, і ў гэтай назве не было б ніякага перабольшвання.

Можна толькі падзівіцца, наколькі трывушчы гэты чалавек: яго забівалі, яго распіналі, яго працягваюць распінаць, а ён жыве. Болей за тое — піша, і яшчэ болей — добра піша. Толькі хіба больш сцюдзёным робіцца бляск яго чэпкіх вачэй, ды яшчэ больш упарта ссунутыя на пераноссі бровы. Ды дабаўляецца сівізны ў валасах.

Але гэта прыкметы знешнія. А ў астатнім, скажам так, унутраным, глыбінным, што вызначае і трымае характар чалавека, яго натуру, ён усё той жа, што і дзесяць, і дваццаць, і трыццаць гадоў таму — зацятая настойлівасць, нязменная бескампраміснасць.

І праца, праца, праца...

У скупой анатацыі да памянёнай кніжкі напісана, што ў ёй "сабраны выступленні, артыкулы, інтэрв'ю часоў перабудовы". Усё так і трошкі не так. Ёсць недакладнасць, на якую можна было б і не звярнуць увагі, але ў дадзеным выпадку яна мае сваё значэнне. Недакладнасць гэтая схавана ў словах "часоў перабудовы".

Адкрываецца кніга выступленнем Быкава на Пятым з'ездзе пісьменнікаў Беларусі. Гэта лета 1966 года. Партыйную арганізацыю Беларусі ўзначальвае, увасабляе, а значыць, шмат у чым вызначае напрамак яе ідэалагічнай і гаспадарчай дзейнасці, як галоўная кіруючая асоба рэспублікі, кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС Пётр Машэраў — энергічны, інтэлігентны, выйгрышна малады ў параўнанні з дружна старэючым Палітбюро.

Увасабляў ён партыйную ўладу і на гэтым пісьменніцкім з'ездзе, сядзеў, як было ўзаконена, у першым радзе прэзідыума побач са старшынёй Саюза пісьменнікаў Петрусём Броўкам.

Як сёння памятаецца момант, калі на трыбуну выйшаў Васіль Быкаў і пачаў гаварыць. Простыя, строга выверанкя словы, глухаваты, напружаны голас.

Гаварыў ён пра літаратуру, але і не толькі пра яе.

На той час і ў Беларусі, і ў Савецкім Саюзе ды і ў Еўропе добра ведалі Быкава-пісьменніка — аўтара аповесці "Жураўліны крык", "Здрада", "Трэцяя ракета", "Альпійская балада", "Мёртвым не баліць". Але нават у Беларусі мала хто ведаў Быкава-публіцыста, Быкава-прамоўцу, мала хто ведаў пра яго яшчэ адзін талент — уменне выступаць, уменне валодаць аўдыторыяй.

І пасля першых некалькіх фразаў пісьменніка, можна сказаць, у самым пачатку яго выступлення ў прэзідыуме сходу раптам адбыўся непрадугледжаны рытуалам рух: Машэраў дэманстрацыйна ўстаў, хуткім крокам перасёк сцэну і знік за кулісамі. Папросту — уцёк...

Усе зразумелі: "гаспадар" злуецца, "гаспадару" штосьці не даспадобы.

Што ж не спадабалася адзначанаму баявой зоркай Героя партызанскаму фаварыту ў выступленні былога франтавіка-артылерыста, знішчальніка нямецкіх танкаў? Ці, можа, былы партызан не зразумеў былога франтавіка?

Зразумеў, але не хацеў разумець!

Улада любіць фіміям. А яшчэ ўлада не любіць праўды. Асабліва той, якая сячэ па вачах. Простай, грубай праўды жыцця, калі яна не славасловіць, а крытыкуе, калі гэтая праўда не адпавядае ідэі "ўзыходжання да вяршыняў камунізму", ідэі няспынных запланаваных перамог... "пад мудрым кіраўніцтвам" і г.д.

А выступоўца, акрамя ўсяго іншага, сказаў такое:

"Па ўсім відаць, наша літаратура перажывае крызіс. І гэта, магчыма, камусьці здасца дзіўным: колькі пра яе гавораць, праяўляюць такія клопаты. Чаму ж гэтае дзіця такое хілае?

Два беларусы на нямецкай зямлі: Васіль Быкаў і Анатоль Кудравец.

Мне здаецца, што прычыны гэтага заняпаду ляжаць якраз там, дзе планаваліся поспехі. Адбылася вельмі простая з'ява: у адносінах да літаратуры дзесьці згубілі меру, яе закіравалі, яе заняньчылі.

Калі ў гаспадарцы валюнтарызм неяк асуджаны, то ў літаратуры ён дасюль квітнее пышным цветам. У народнай гаспадарцы ўжо не так камандуюць, як у літаратуры. Вытворчыя адносіны там прымушаюць лічыцца з нейкай натуральнасцю і заканамернасцю. Літаратура ж застаецца тым, чым была сельская гаспадарка ў нядаўнім мінулым, — кожны мае да яе адносіны і пры выпадку не праміне патаптаць яе і без таго не вельмі ўраджайны агарод".

Па сённяшніх мерках як быццам нічога "страшнага" і не было сказана. Гэта па сённяшніх. Хаця б таму, што сёння пытанні літаратуры ўладу мала цікавяць, або цікавяць настолькі, наколькі яна пяе асанну яе палітыцы і не перашкаджае ўладзе тварыць сваё. Але — тады быў яшчэ т о й час. Час, калі вышэйшыя партыйныя кіраўнікі ўсіх "свабодных і роўных" са скуры вылузваліся, каб высвеціць поспехі сваіх рэспублік ва ўсіх сферах жыцця, а адначасова засведчыць вернаадданасць "малодшых братоў" вялікаму "старэйшаму брату". Беларусь не была выключэннем. Па ўсіх "паказчыках" яна ішла, як модна было гаварыць, "у ліку першых" (апошніх не было ніколі).

І кожны з'езд, ці то калгасны, ці рабочы, не кажучы ўжо пра партыйны, — гэта быў з'езд "пераможцаў", гэта дасягненні, гэта фанфары...

Меркавалася, што і той пісьменніцкі з'езд пойдзе па загадзя пракладзеных рэйках, і даклад старшыні Саюза даў яму добры разбег у гэтым накірунку, і раптам...

І раптам "літаратура перажывае крызіс...". Болей за тое, "яе закіравалі, яе заняньчылі...". Яшчэ болей: "кожны... пры выпадку не праміне патаптаць яе і без таго не вельмі ўраджайны агарод".

І гэта сказана, нягледзячы на **прэзідыум**... А можа, якраз і гледзячы на **прэзідыум**?..

А ў прэзідыуме сядзелі не толькі свае, мясцовыя. Сядзелі там і госці з іншых рэспублік. Сядзелі там і строгія "куратары" з Белакаменнай. А яны ўжо даложаць, яны распішуць, як у Беларусі-партызанцы "заняньчылі", "затапталі"... І бяда не ў нейкай там літаратуры, літаратура хай сабе. А вось як **такое** публічнае выступленне стала магчыма, чаму дапусцілі, чаму не спынілі?.. Значыць, дрэнна працуюць, значыць, аслаблены гужы, значыць... Шмат розных "значыць" можна знайсці ў такім выступленні!

Словам, былі прычыны для Першага сакратара кампартыі рэспублікі пакінуць пісьменніцкі прэзідыум.

Дык вось: 1966 год. Да так званай гарбачоўскай перабудовы яшчэ добрых дваццаць гадоў!

Кожны сапраўдны мастак — без усялякай на тое самазадачы, хоча ён таго, ці не хоча, — прагназуючы лёс сваіх герояў, прагназуе і свой лёс. І тут няма нічога надзвычайнага. Расказваючы пра сваіх герояў, колькі б іх ні было і якія б яны ні былі, пісьменнік заўсёды расказвае пра с я б е.

Калі гаварыць пра лёс пісьменніка Васіля Быкава — не ў нейкім канкрэтным, вузка фактаграфічным плане, а ў плане гіпатэтычным, прадказальным, то мне здаецца, што больш чым у якім іншым творы ён закадзіраваны ў аповесці "Жураўліны крык". У такім разуменні аповесць уяўляецца мне адным з самых аўтабіяграфічных твораў празаіка.

Маленькі чыгуначны пераезд. Жменька амаль бяззбройных савецкіх салдатаў-смяротнікаў, пакінутых абараняць пераезд ад жалезнай варожай навалы. Ідзе бой. Сілы няроўныя. Адзін за адным гінуць абаронцы. Застаўся апошні з адзінай гранатай. Ззаду, замест брані, земляная сценка акопа, спераду насоўваюцца сталёвыя крыжастыя страшыдлы, а ў небе, як уверцюра да таго, што павінна адбыцца, — тужлівы жураўліны крык, які прадказвае хутчэй блізкую немінучую смерць, чым безнадзейную веру ў перамогу.

Аповесць напісана ў 1959 годзе, і з адлегласці пройдзенага часу вельмі добра відаць, як блізка яе трагічныя перыпетыі праецыруюцца на карту жыцця аўтара.

Пасля аповесці "Мёртвым не баліць" па акопе франтавіка-пісьменніка быў адкрыты агонь з усіх відаў зброі, можна сказаць, аж да артылерыі "рэзерва галоўнага камандавання". На змену прымітыўнаму шантажу і маральнаму тэрору прыйшла недвухсэнсоўная пагроза фізічнай расправы.

Наколькі гэта было сур'ёзна, гаворыць такое: сам старшыня тадышняга Камітэта дзяржбяспекі СССР Ю.Андропаў дакладваў у ЦК КПСС:

"Камітэт дзяржаўнай бяспекі Беларусі мае звесткі аб нездаровых настроях беларускіх пісьменнікаў — члена КПСС Карпюка і Быкава... Карпюк нелегальна распаўсюджвае сярод сваіх знаёмых усялякія пасквілі ў выглядзе кнігі Гінзбург-Аксёнавай "Круты маршрут" і іншыя. Адмоўна ўздзейнічае на моладзь. Пад яго ўплывам студэнт Гродзенскага педінстытута Малашэнка піша вершы, прасякнутыя песімізмам і ўпадніцтвам, некаторыя з іх утрымліваюць шкодны палітычны сэнс... Погляды Карпюка ў пэўнай ступені падзяляе Быкаў, аўтар тэндэнцыйнай аповесці "Мёртвым не баліць"... У цяперашні час да Быкава выказваюць інтарэс ідэалагічныя цэнтры ворага. Гэта відно, прынамсі, з перапіскі з ім супрацоўніка закрытага сектара "Народна-працоўнага саюза" (НПС), якая вядзе яго антысавецкую апрацоўку. З Быкавым устанавіў кантакт італьянец Поджы, які падазраецца ў прыналежнасці да спецорганаў ворага... Камітэт дзяржбяспекі Беларусі з санкцыі ЦК кампартыі рэспублікі рыхтуе мерапрыемствы, накіраваныя на прадухіленне магчымых варожых акцый з боку названых асобаў".

(Заканчэнне на 4-й стар.)

ДАЙДЖЕСТ

В Китае от атипичной пневмонии уже погиб 51 человек

В Китае число жертв атипичной пневмонии достигло 51 человека. Общее же число больных в Китае, по официальным данным, составило 1 тысячу 247 человек.

Как сообщил представитель Министерства здравоохранения КНР Ци Сяоцю, за четыре апрельских дня зарегистрировано 57 новых пациентов, 5 человек за это же время скончались. В числе погибших — два иностранца. "Подавляющее большинство новых случаев заболевания фиксируется в провинции Гуандун", — сообщил представитель министерства.

Между тем находящиеся уже три дня в провинции Гуандун эксперты Всемирной организации здравоохранения заявляют, что получили большое количество информации о заболевании. Однако сообщить что-либо о происхождении страшного вируса специалисты пока не могут.

Великобритания выдворяет радикального мусульманского проповедника

Власти Великобритании лишили гражданства радикального мусульманского проповедника Абу-Хамза Аль-Масри. Согласно новому законодательству Великобритании, все иммигранты с двойным гражданством, чьи высказывания могут противоречить государственным интересам, подлежат депортации. Аль-Масри станет первым гражданином Великобритании, к которому будет применен новый закон.

Аль-Масри давно известен своими резкими высказываниями. Так, он неоднократно выражал радость в связи с террористическими актами 11 сентября 2001 года в США и катастрофой шаттла Columbia. Его радикальная позиция вынудила британские власти лишить его права проповедовать в Центральной мечети северного Лондона. Несмотря на запрет, Аль-Масри продолжил проповеди на улице рядом с мечетью. Как сообщил BBC британский министр внутренних дел Дэвид Бланкетт, проповеднику уже направлено письмо, в котором сообщается о лишении его гражданства.

Убили около тысячи человек за три часа

Около тысячи человек были убиты и похоронены в братских могилах конголезскими боевиками, сообщается со ссылкой на источник в ООН. "В следственную комиссию ООН поступила информация об убийстве 966 человек. Члены комиссии обнаружили 20 братских могил и посетили 49 тяжелораненых граждан страны, в результате бойни оказавшихся в больнице", — сообщил пресс-секретарь миссии ООН в Конго Хамадун Тур.

Гарри Поттер выиграл суд у Тани Гроттер

Амстердамский суд запретил первое зарубежное издание книги "Таня Гроттер и магический контрабас" российского писателя Дмитрия Емеца. С соответствующим иском обратилась автор книг о мальчике-волшебнике Гарри Поттере Джоан Роулинг вместе с медиа-гигантом Time Warner, который выпустил два фильма по ее произведениям. Суд признал, что книга Емеца копирует книгу "Гарри Поттер и философский камень". Первое зарубежное издание произведений Емеца готовило издательство Byblos. Оно планировало выпустить "Таню Гроттер и магический контрабас" 7-тысячным тиражом. Суд постановил, что Byblos должно "прекратить нарушения авторских прав Роулинг".

Участники мафиозного клана сознались в убийстве Джинджича

Министр внутренних дел Сербии Душан Михайлович заявил, что полиция практически закончила расследование дела об убийстве премьер-министра Зорана Джинджича (на фото). Это сообщение было сделано после того, как главные подозреваемые в причастности к этому преступлению признали свою вину. Еще не арестованы все члены земунского клана, которые были вовлечены в подготовку убийства, но, по словам министра, полиция уже собрала достаточно доказательств.

"С убийством все прояснено, известен список лиц, к нему причастных. Большинство исполнителей, включая человека, стрелявшего в премьера, сидят в тюрьме и уже сознались", — сказал Михайлович. Звездан Йованович, снайпер, убивший Джинджича, был арестован 25 марта. О тех подозреваемых, кто еще находится на свободе, министр сказал: "Это только вопрос времени, когда мы их возьмем. В любом случае, это уже не является жизненно важным для раскрытия преступления".

Число заключенных в США превысило два миллиона человек

Министерство юстиции США обнародовало данные отчета о состоянии американских тюрем. Из документа следует, что число заключенных в США превысило два миллиона человек. Таким образом, по одному заключенному приходится на каждых 142 жителя этой страны. Отмечается, что число отбывающих заключение увеличилось с 1990 года почти вдвое. США известны как страна с наибольшим количеством заключенных в мире.

Согласно отчету, в тюрьмах в настоящее время сидит 12% черного мужского населения США, 4% латиноамериканского мужского населения и 1,6% белого мужского населения в возрасте 20—30 лет. По числу заключенных первое место занимает общефедеральная система исполнения наказаний: в подведомственных ей тюрьмах отбывают заключение более 161 с половиной тысячи человек. Далее идут штат Калифорния, где сидит около 160 тысяч человек, и штат Техас, число заключенных в котором насчитывает более 158 тысяч.

ПРЕСС-КЛУБ

Бог — не только любовь

"Общество и религия, свобода вероисповедания, взаимоотношения церкви и государства в Республике Беларусь" — такова была тема заседания пресс-клуба, организованного представительством Совета по международным исследованиям и обменам (IREX) совместно с Центрально- и Восточноевропейской правовой инициативой Американской ассоциации юристов (ABA/CEELI) в Республике Беларусь.

Организаторы мероприятия попытались дать возможность журналистам ознакомиться с мнениями представителей власти и руководителей разных религиозных конфессий относительно вопросов взаимодействия религиозных объединений и государства, обсудить практику применения Закона "О свободе совести и религиозных организациях".

Действительно, увидено и услышано немало. Но далеко не на все вопросы журналисты получили исчерпывающие ответы. Так, Наталья Кутузова, научный сотрудник Института философии Академии наук, которая делала доклад по государственно-религиозной политике, не смогла ответить на вопрос: "Почему государство преследует белорусскую автокефальную (независимую от Москвы) православную церковь?"

